**А.У.Рагуля,** *прафесар*

# СУСТРЭЧНЫ ВЫКЛІК

Навейшая і найноўшая гісторыя еўрапейскай цывілізацыі кваліфікуецца як эпоха мадэрнізму і постмадэрнізму. Тэрміны гэтыя самі ў сабе не нясуць якой-небудзь спецыфічнай прэдыкатызацыі і не адлюстроўваюць унутраную спецыфіку стылю. Больш таго, зацямняюць крызісны характар эпохі, карціну біфуркацыі і ўзаемадзеяння процілеглых сацыяльных вектараў. Сучасныя мадэрнасць і постмадэрнасць маюць нямала гістарычных прэцэдэнтаў. Адзін з найбольш яскравых прыкладаў – гэта крызіс дравідыйскай цывілізацыі ў другім тысячагоддзі да новай эры. Гаспадаранне варварскіх арыйскіх плямён на цывілізацыйнай прасторы Махенджа Дара і Харапы закончылася спусташэннем і разбурэннем гарадской культуры, ліквідацыяй дзяржаўнай арганізацыі соцыуму. Эпоха элінізму, антычнай постмадэрнасці, мела аналагічны фінал – трансфармацыю ў эпоху пяці "цёмных вякоў" еўрапейскага ранняга Сярэднявечча. Крызіс феадальнай саслоўна-кастывай культуры ў XVII ст. у Еўропе таксама суправаджаўся абуджэннем цёмных сіл, паляваннем на ведзьмаў, спальваннем вучоных і філосафаў. Станаўленне еўрапейскай культуры індустрыйна-гандлёвага тыпу было асветлена агнём свяшчэннай інквізіцыі. У сучасным крызісе соцыуму, заснаванага на абсалютызацыі вызваленай ад культуры рынкавай кан'юнктуры, выразна бачыцца характэрнасць пераходнага ў канцы цыкла перыяду, абазначанага сёння вельмі цьмянымі тэрмінамі. Мадэрнасць і постмадэрнасць – гэта не што іншае, як сучаснасць, якая вычарпала свой патэнцыял культурнай дынамікі, не дасягнуўшы той светлай будучыні, якая мроілася, планавалася, чакалася. Страта ідэалу абясцэньвае значэнне мінуўшчыны. Узнікаюць умовы, спрыяльныя для замены навукі паралогіяй, гульняў у "эпістэмалагічную няпэўнасць", канец Еўропы, знікненне аўтара, стылю, гісторыі, асобы і да т.п.

У пошуках выйсця з сучаснага крызісу еўрапейская тэарэтычная думка спыніла сваю ўвагу на праблеме стымулаў пераадолення паласы дэкадансу. Арнольд Тойнбі ў сваёй шматтомнай працы "Спасціжэнне гісторыі" вызначае два віды стымулаў цывілізацыйнага развіцця: "стымулы прыроднага асяроддзя і стымулы чалавечага акружэння" [5, с. 120]. Апошнія

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

аўтар кваліфікуе як выклік, які сусветны розум нібыта кідае таму ці іншаму народу. Інакш кажучы, стымул чалавечага акружэння кваліфікуецца як стымул ціску, гэта значыць агрэсіі. Нікольκі не зніжаючы вялікага значэння культурфіласофскай спадчыны англійскага даследчыка, усё ж адзначым, што ў яго супярэчлівай тэорыі закладзена магчымасць навейшай апалогіі культурнага імперыялізму. Сёння канцэпцыя сутыкнення цывілізацый прэтэндуе на ролю універсальнай тэорыі культурнага працэсу. Галоўным віноўнікам ваенных канфліктаў абвяшчаюцца нацыяналісты, якія змагаюцца за культурны суверэнітэт. Аўтары кнігі “Вайна і антывайна” Элвін Тофлер і Хэйдзі Тофлер заяўляюць адкрыта, без ценю якой бы то ні было дыпламатыі і метафізікі: “Краіны, эканоміку якіх пераўтварае Трэцяя хваля, вымушаны здаць частку свайго суверэнітэту і цярпець эканамічнае і культурнае ўварванне адна другой” [6, с. 55]. Вось так выглядае сёння тэорыя стымулаў, ціску і выкліку ў эвалюцыйнай дынаміцы. Фактычна “ўварванне” атаясамліваецца з сусветным розумам. А гэта ўжо само па сабе з’яўляецца красамоўнай ілюстрацыяй тэорыі выкліку – праўда, не таго, які чамусьці кідае паспалітаму люду сусветны розум, а якраз наадварот, выкліку, кінутага сусветнаму розуму татальным злом сучаснасці.

Атамістычная канцэпцыя культуры ўжо ў эпоху агульнаеўрапейскага Рэнесанса – класікі феадальна-саслоўнай культуры – эвалюцыянавала ў макіявелізм, увасоблены ў вобразе гібрыднага мутанта Льва-Ліса ў вядомым трактаце “Уладар”. Рэдукцыю Н.Макіявелі Ф.Ніцшэ давёў да крайняй мяжы – ідэалу “звышчалавека”, вызваленага ад “усяго чалавечага, праз меру чалавечага”, гэта значыць выпусташанага робата, цалкам прыдатнага для практыкі ў фабрыках смерці. Бальшавіцкія ідэолагі культ крыві трансфармавалі ў канцэпцыю ўнутранага кровазліцця ў татальнай класавай вайне, татальнай дыктатуры, універсальнай казармы. Аматары сучасных парафіласофскіх гульняў у парадоксы рэгрэсу, дэканструкцыю, інтэртэкст, сімулякры, канец гісторыі адцягнулі ўвагу грамадскай думкі ад праблемы сінтэзу і станаўлення новага супольнага суб’екта. Цьмяная аналітыка Ж.Дэлёза, Ж.Дарыда, Ж.Бадрыяра, Ж.-Ф.Ліатара пакідае без увагі нахрапістыя намаганні сцвердзіць безальтэрнатыўнасць вайны, акупацыі, несвабоды, шызафрэніі, наркаманіі як стану і сістэмы чалавечага існавання. У гэтым, на

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

думку Б.Ульрыха, «сэнс рабскай цывілізатарскай маралі, у рамках якой на грамадскім і індывідуальным узроўні паводзяць сябе так, нібы ўсе мы падпарадкаваны неадхільнаму лёсу, “закону падзення” сістэмы» [7, с. 594]. У сучасным грамадстве рызыкі, на думку Б.Ульрыха, “гадзіннікавы механізм у бомбе адлічвае час”. Варта тут успомніць і бомбу, якая чакае свайго часу ў аповесці В.Быкава “Знак бяды”. Мастацкае папярэджанне беларускага празаіка прагучала яшчэ да пачатку чарнобыльскай катастрофы і сучаснай тэрарыстычнай вайны.

Сустрэчны выклік грубай і вытанчанай апалогіі быцця-вайны і існавання-акупацыі выказала культура нацыянальна-адраджэнскіх рухаў. У.Самойла, адзін з найбольш яркіх у Еўропе даследчыкаў культурнага сэнсу адраджэння і новага хрысціянства, пісаў у 1924 г.: “Іменна ператварэнне зла ў дабро і становіць запраўдную мэту ўсяго жывога, запраўднае прызнанне і найвышэйшае назначэнне чалавека” [4, с. 112]. Беларускі мысліцель разводзіў паняцці “вайна” і “змаганне”. Бальшавіцкую прапаганду класавай вайны У.Самойла параўноўваў з алкагольным ачмурэннем. Жыццёвасць сваёй утопіі, свайго ідэалу мысліцель пацвярджаў аналізам рэальнай гісторыі адраджэння нацыянальнага і індывідуальнага Я еўрапейскіх народаў, ісцінай хрысціянскага дабрадзеяння: “Тая сіла ў чалавеку, што, ніколі не знікаючы, голасам самога Бога ў нас падбівае нас усцяж займацца гэтым ператварэннем зла ў дабро, і ёсць разумная энергія” [4, с. 112].

Падобныя выказванні беларускага мысліцеля адлюстроўваюць гісторыю адраджэння нацыянальнай этыкі – аснову палітычнай культуры суверэннай Беларускай дзяржавы. На гэтым жа шляху ішло і станаўленне нацыянальнай эстэтыкі:

Праўду з няпраўдай,
Цноту з гарэзіяй
Вымешай спрытам, –
Будзе паэзія.
.......................................

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Свет, людзі-шэльмы

Крадуць, лгуць шчыра,

Чэсны паэта, –

Вось вам сатыра.

*Янка Купала. Паэзія, 1906 [1, с. 108].*

Рэзкі разрыў з дэкаратыўнай эстэтыкай прыгажосці быў адначасовым сцвярджэннем прынцыпаў эстэтыкі жыцця, сэнс якога складае сінтэз этычнага і эстэтычнага ідэалаў, пераплаўка брутальнай і пачварнай рэчаіснасці ў хараство. Яго магчымасці аб’ектыўна існуюць у крэатыўнай сіле прыроды. Устаноўка на сцвярджэнне жыцця-красы, жыцця-хараства, даследаванне арыентацыі нацыянальнага менталітэту на комплекс “чалавек прыгожы” яшчэ, на жаль, мала каго цікавіць з сучасных гуманітарыяў. На працягу дзесяцігоддзяў гэтую праблему з поспехам даследуе выдатны філосаф і культуролаг Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі. Яго фундаментальная праца “Бляск і трагедыя ідэалу” (2004) засведчыла сталасць і арыгінальнасць сучаснай беларускай культурфіласофіі, яе здольнасць ва ўмовах вывіхаў і шараханняў крызіснай эпохі ісці шляхам сінтэтычнага абагульнення інтэлектуальнага, маральнага і эстэтычнага вопыту, агульначалавечага і айчыннага.

Вопыт беларускага нацыянальнага духу ў XX ст. высвечвае істотны змястоўны момант у культуры перыяду мадэрнасцяў і постмадэрнасцяў – пошук новага сінтэзу, заканамернасці станаўлення новага супольнага суб’екта. Не адмаўленне ад культурнай спадчыны, а актуалізацыя яе духоўнага патэнцыялу, удасканаленне эмацыянальнай і інтэлектуальнай сферы асобы – так можна акрэсліць важнейшыя функцыі культуры ў часы мадэрнасцяў.

Выпрабаваннем для нацыянальнай культуры была эпоха Новага часу – феадальнай постмадэрнасці ў XVII ст. Магнатэрыя здрадзіла спартанскім ідэалам літвінізму. Дзеля апраўдання ўласнай дэградацыі і прэтэнзій на асобае становішча была прыдумана ідэалогія сарматызму. Шляхецкая рэспубліка стала краем мультытыраніі. У канцы XVII ст. яе падзялілі паміж сабой імперскія рэжымы Расіі, Прусіі і Аўстрыі.

Страта палітычнай самастойнасці, аднак, не спыніла ў Беларусі працэсу станаўлення новага, дэмакратычнага суб’екта культуры. Фальклярызацыя культурнага працэсу ў XVII ст. зрабіла моцны ўплыў на гуманістычную арыентацыю ў мастацтве і філасофіі. Сацыяльная філасофія XVII–XVIII стст., якая сёння інтэрпрэтуецца як з’ява эклектыкі, на самай справе апярэджвала заходнееўрапейскую думку. Сакратаўскі пераварот у галіне антрапалогіі і быў здзейснены ў філасофіі Лукі Залускага (1604–1676). У сваёй “Агульнай філасофіі” ён вынес на першы план навукі пра чалавека, а не фармальную логіку і навукі пра прыроду. “Правільна філасофстваваць, – пісаў Л.Залускі, – гэта значыць, пазнаўшы многае і амаль што ўсё, ажыццявіць найлепшае” [3, с. 93]. У беларускай філасофіі Новага часу назіраецца крытычнае стаўленне не толькі да схаластыкі, але і да радыкальнага брытанскага эмпірызму і картэзіянскага дуалізму. Філасофія расчышчала глебу для духоўнага самасцвярджэння суб’екта з рамантычным светаўспрыманнем, адкрываючы ў культурнай дзейнасці прастор для фальклорнай эстэтыкі: “…без афектаў усялякае дзеянне і сіла вяне, і моц душы слабее” [3, с. 97]. Жыццё ў палацах, падкрэсліваў Л.Залускі, гэта суцэльны ланцуг забаў, вызваленых ад “маральнай дабрадзейнасці” і “дабра змястоўнага”. Прапанаваная беларускімі мысліцелямі канцэпталогія была правобразам ідэальных тыпаў мыслядзеяння, якія атрымалі далейшае развіццё ў канцы XVIII і пачатку XIX ст. у філасофіі нямецкага класічнага ідэалізму. Так закладваліся інтэлектуальныя і духоўныя гельштаты рамантызму, прынцыпова іншага ў параўнанні з макіявелізмам, банапартызмам і байранізмам. У гісторыі культуры гэты тып інтэлектуальнага і маральнага дабрадзеяння ўвасоблены ў гісторыі жыцця і смерці такіх мысліцеляў, як А.Баэцый, Я.Гус, Дж.Бруна, К.Лышчынскі, К.Каліноўскі. Пра сацыяльную значымасць акрэсленай арыентацыі пераканаўча сведчыць гісторыя нацыянальна-вызваленчага руху з часоў Т.Касцюшкі да нашых дзён. Беларуская нацыянальная ідэя валодае моцным імунітэтам у супрацьстаянні пазітывізму і прагматызму.

Кантынуумная канцэпцыя супольнага суб’екта ў беларускай культуры заканамерна сфарміравала крытычнае стаўленне да любых формаў імперскай ідэалогіі і цэнтрысцкіх тэорый з іх канцэпцыяй гістарычных і негістарычных народаў (Данілеўскі), пасіянарных і непасіянарных (Гумілёў) нацый. Сустрэчным

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

выклікам падобным тэорыям сталі сацыяльная філасофія і эстэтыка У.Самойлы, І.Канчэўскага, В.Ластоўскага, А.Станкевіча, Я.Станкевіча. В.Ластоўскі невыпадкова прысвечаную К.Каліноўскаму нататку назваў “Памяці Справядлівага”. Імкнучыся аднавіць справядлівасць, В.Ластоўскі стварыў арыгінальную гнасеалагічную гіпотэзу, у якой выказаўся супраць грэкацэнтрысцкай інтэрпрэтацыі еўрапейскай Антычнасці. У шэрагу мастацка-філасофскіх (“Лабірынты”) і публіцыстычных твораў В.Ластоўскі раскрывае ролю славянскага ўплыву на ахейцаў і элінаў у другім тысячагоддзі да н.э. Горад Троя быў заснаваны славянамі ў час іх знаходжання на сваёй прарадзіме на Балканах. Гэта быў, на думку В.Ластоўскага, час росквіту культуры на стадыі протадзяржаўнай арганізацыі славянскага соцыуму. Годнасць асобы і пашана да агулу вызначалі напрамак жыццядзеяння славянскай абшчыны. Падобныя нормы былі характэрнымі і для кельтаў, якія займалі вялікую тэрыторыю на захадзе і ў цэнтры Еўропы. Кельцкі і славянскі культурныя субстраты адыгралі вялікую ролю ў фарміраванні здольнасці супрацьстаяння некрафільству, якое стала ядром афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіі ў імперыях, што ўзніклі ў эпоху Сярэднявечча на руінах антычнай цывілізацыі.

Даследаванне праблемы “выклік – адказ” адкрывае, кажучы словамі К.Чорнага, новыя “пласты жыццяздольнасці” нацыі як суб’екта ў агульным культурным працэсе.

1. *Купала, Я.* Збор твораў: у 9 т. / Я.Купала. – Мн.: Маст. літ., 1995. – 2003. – Т. 1.

2. *Ластоўскі, В.* Выбраныя творы / В.Ластоўскі; уклад., прадмова і каментарый Я.Янушкевіча. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1997.

3. *Памятники* философской мысли Белоруссии XVIII в. / В.В.Дубровский, М.В.Кашуба, С.А.Подокшин [и др.]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991.

4. *Самойла, У.* “Гэтым пераможаш!...” // Беларуская думка XX ст. / уклад. Ю.Гарбінскі. – Варшава, 1998.

5. *Тойнби, А.Дж.* Постижение истории / А.Дж.Тойнби. – М.: Прогресс, 1991.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

6. *Тоффлер, Э.* Война и антивойна / Э.Тоффлер. – М.: АСТ: Транзиткнига, 2005.

7. *Ульрих, Б.* Общество риска. На пути к другому модерну / Б.Ульрих // Хрестоматия по культурологии / Г.В.Драч [и др.]. – Ростов н/Д.: Феникс, 2005.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ